Сканворд



Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, *г. Мінск.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ПАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Цукер. Вершы. Адбой. Чырвок. Зіма. Арэта. Какос. Тлен. Суп. Аўтобук. Дуга. Корпер. Пада. Кардар. Рыбак. Кара. **Па вертыкалі:** Сувязіст. Цешча. Кнара. Рыбка. Ганка. Дорпат. Трое. Кнас. Сноп. Гад. Банкір. Ўпадар. Опера. Кунак. Гара. Ала.

Даты Падзеі Людзі

22 КРАСАВІКА

571 год — нарадзіўся прарок Мухамед, арабскі прапаведнік адзінабожжа і цэнтральная, пасля адзінага Бога, фігура ісламу.

1838 — упершыню параход перасек Атлантычны акіян; у гавань Нью-Ёрка прыбыў англійскі пасажырскі колавы параход «Сірыус».

1870 год — нарадзіўся Уладзімір Ільіч Ульянаў (Ленін), расійскі, савецкі палітычны і дзяржаўны дзеяч, стваральнік Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (бальшавікоў), адзін з галоўных арганізатараў і кіраўнікоў Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года ў Расіі, першы старшыня Савета Народных Камісараў (урада) РСФСР, стваральнік першай у сусветнай гісторыі сацыялістычнай дзяржавы.

1931 год — Саўнаркам СССР прыняў пастанову аб савецкім грамадзянстве.

1937 год — нарадзіўся Джэк Нікалсан, амерыканскі акцёр, сцэнарыст, рэжысёр, прадзюсар. Здымаўся ў фільмах «Палёт над гняздом зязюлі», «Іствікскія ведзьмы», «Паштальён заўсёды звоніць двойчы» і іншых. Лаўрэат прэміі «Оскар» (1976, 1984, 1998) і іншых прэстыжных міжнародных прэмій у галіне кінамастацтва.

1945 год — у ходзе Берлінскай аперацыі перадавыя часткі Чырвонай арміі ўваходзяць у сталіцу III рэйха і пачынаюць рыхтаваць штурм Берліна.

1972 год — Ленінская прэмія прысуджана Івану Мележу за раманы «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы».

Было сказана

Кузьма ЧОРНЫ, беларускі пісьменнік:

«Вялікі доктар усялякай хворасці ў чалавечай душы — час — мае вечнага свайго дапаможніка — працу».

Наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе 26 красавіка.

■ Повязь Роду

ПЕРШЫ БЛІН — ПРОДКАМ

Як беларусы шануюць тых, хто ахоўвае з нябыту

У традыцыйнай культуры беларусаў да падземнага (хтанічнага) свету — свету нашых продкаў, стаўленне было асабліва паважлівае. Менавіта яны лічыліся сапраўднымі гаспадарамі зямлі. Ад іх добразычлівасці залежаў ураджай, а значыцца, і дабрабыт сям'і. Відавочна, таму ў народным календары значнае месца адводзіцца абрадавым дзеянням, накіраваным на ўшанаванне продкаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Яшчэ раз засяродзім увагу на святочным колазвароце дзён беларусаў. Нельга не адзначыць адну вельмі выразную асаблівасць народнага календара. Пераважная большасць свят у сваёй лагічнай паслядоўнасці зарыентавана на дыялог чалавека з Прыродай, з Космасам, асноўны сэнс якога — заручыцца падтрымкай сіл прыроды, каб яны актыўна і эфектыўна паспрыялі вялікаму, складанаму і працягламу па часе цыклу сельскагаспадарчых (у аснове сваёй земляробчых) работ. Аднак нельга не заўважыць, што ў гэты адладжаны рытм земляробчых спраў уключаны два святы, характар і сэнсавае напаўненне якіх прынцыпова адрозніваецца ад усіх астатніх. Гэта Радаўніца і Восеньскія Дзяды (хоць у розных месцах памінальным днём маглі быць: першы або другі дзень Вялікадня, чацвер на Велікодным тыдні — Наўскі Вялікдзень; у межах аднаго і таго ж раёна, напрыклад Чэрвеньскага, побач знаходзяцца вёскі, у адной з якіх веснавое ўшанаванне продкаў адбываецца на Радаўніцу, у другой у суботу перад Тройцай). Неабходна адзначыць, што на працягу года амаль што ўсе суботы, папярэднія вялікім святам, прысвячаліся продкам: Масленічныя, Стрэчаньскія, Траецкія, Дзмітраўскія, Міхайлаўскія Дзяды, часцей за ўсё іх звалі радзіцельскімі суботамі. Аднак Восеньскія Дзяды і Радаўніца былі самымі вядомымі.

Калі намаляваць кола, якое сімвалізуе гадавы цыкл свят, і злучыць лініяй веснавы і восеньскі дні ўшанавання памерлых, то выразна відаць, што гэтыя святы як бы акрэслівалі паўсферу, якая ахоплівала час правядзення асноўных земляробчых работ. Гэтыя дні ўшанавання продкаў фіксавалі мяжу пачатку і заканчэння найважнейшага цыкла аграрна-каляндарных святкаванняў. Калі ж улічыць, што старажытны пачатак Новага года ў беларусаў супадаў з днём веснавога раўнадзенства, то можна ўявіць, што першым святам новага жыццёвага цыкла станавілася Радаўніца. Чым гэта абгрунтавана і як гэта можна растлумачыць? Каб знайсці адказ на гэтыя пытанні, неабходна звярнуцца да структуры асноўных святочна-абрадавых комплексаў народнага календара і паспрабаваць знайсці тое, што ўсіх іх аб'ядноўвае.

Такім чынам, аснову традыцыйнага светапогляду складала вось, якая аб'ядноўвала Нябесную сферу і сферу продкаў. Чалавек адначасова звяртаўся па дапамогу да Сонца, Месяца, зорак, Багоў, а таксама і да «трыдзявятага царства» — свету продкаў. Гэта скіраванасць выразна прадстаўлена ў казках, замовах, загадках, прыказках.

Можна без перабольшання сцвярджаць, што гэта адзін з самых галоўных структураўтваральных прынцыпаў не толькі кожнага рытуальна-абрадавага комплексу паасобку, але і календара ў цэлым. Больш таго, калі ў адных абрадавых структурах ён быў «адным з некалькіх раўназначных», то ў іншых гэта быў ключавы фактар, які жорстка рэгламентаваў паводзіны ўсіх удзельнікаў.

Каб больш выразна і шматбакова паказаць месца і ролю для беларускай этнакультурнай традыцыі культу продкаў, мы выдзяляем з гэтага прынцыпу яшчэ адзін складальнік, які фармулюем як жорсткае табу, як неабвержнае прадпісанне, якое рэгламентуе нашы паводзіны ў абрадавых сітуацыях: «Перш чым сабе — продкам!»

У якасці ілюстрацыі прывядзём некалькі прыкладаў:

1. Сярод беларусаў і сёння шырока бытуе прыказка «Першы блін комам», сэнс якой у другой палове XX ст. пачалі тлумачыць наступным чынам: адсутнасць вопыту часта прыводзіць да таго, што задуманае не ўдаецца цалкам здзейсніць. Дапускаецца і ўласна натуралістычнае тлумачэнне: наша паспешлівасць ва ўжыванні страў прыводзіць да таго, што гарачы блін «перасядае».

Аднак шматлікія абрадавыя кантэксты дазваляюць даць зусім іншую інтэрпрэтацыю зместу прыказкі. У асяроддзі беларусаў існаваў звычай: на кожнае вялікае свята ў сям'і абавязкова пяклі бліны (ячныя, пшанічныя, бульбяныя, жытнія, грэцкія), але першы спечаны блін (у адпаведнасці з патрабаваннем этыкетна-нарматыўнага прадпісання) клалі на сподак і ставілі ў чырвоны кут пад абразы або на падаконнік, таму што ён прызначаўся душам памерлых продкаў. Тры дні ляжаў гэты блін на самым пачэсным месцы, затым яго аддавалі птушкам, якія, паляцеўшы на поўдзень — у «вы-рай», перададуць прывітанне памерламу роднаму. А калі хто-небудзь парушаў прадпісанне звычаёвага права і спрабаваў сам з'есці блін, то ён (блін) і «станавіўся колам».

2. Усе ўдзельнікі жалобнага стала таксама падпарадкоўваліся найважнейшаму абрадафарміруючаму прынцыпу, г. зн. першую чарку налівалі памерламу; абсалютна кожная страва, пададзеная на стол, павінна быць патрошку адкладзена ў талерку памерламу.

3. На Саракі (22.03) гаспадыні выпякалі печыва ў выглядзе птушачак — «жаваранкаў», перш чым есці самім і прапанаваць дзецям, якія з гэтымі «птушкамі» гукалі вясну, адно з іх тут жа кідалі назад у печ — прыносілі ахвяру продкам свайго роду.

4. На ўсёй Беларусі да сённяшняга дня жанчыны, у якіх памерлі малыя дзеці, прытрымліваюцца забароны ўжываць яблыкі да Яблычнага Спаса (19.08). Хрысціянская легенда сведчыць, што ў гэты дзень Бог адорвае памерлых дзяцей рознымі пачастункамі, сярод якіх ёсць і яблыкі. Калі ж чыя-небудзь маці не ўтрымалася і з'ела яблык да Спаса, то лічылася, што дзіця на «тым» свеце застанецца без падарунка. Таму першыя яблыкі новага ўраджаю на Спас асвячалі ў храме і неслі на магілы дзяцей. Такім чынам адбывалася памінанне заў-час-на (не ў пару, раней, чым трэба) памерлых дзяцей.

5. У ранейшыя часы існаваў звычай: маладыя адразу пасля вянчання выходзілі з храма і ішлі да магіл сваіх продкаў, таму што могілкі былі тут жа, у непасрэднай блізкасці. Ад сучаснага месца рэгістрацыі шлюбу — загса — да бацькоўскіх могілак далёка. Аднак у памяці людзей усё роўна захаваўся спрадвечны прынцып: перш чым маладыя паедуць да вясельнага стала, яны абавязкова павінны накіравацца да брацкіх магіл або іншых рытуальных мясцін, звязаных з ушанаваннем загінулых або памерлых і схіліць галаву — пакланіцца (!!!) продкам.

6. Нагадаем яшчэ адно даволі жорсткае папярэджанне, шырока вядомае сярод старэйшых людзей: «Не чапай зямлю да Радаўніцы або да Благавешчання — можа быць смерць у вашай сям'і». Растлумачым. Прыходзіла вясна. Чалавек рыхтаваўся да пачатку вялікага цыкла сельскагаспадарчых прац. Аднак традыцыйны светапогляд прытрымліваўся няўхільнага правіла: перш чым наводзіць парадак на сваім прысядзібным участку, неабходна было навесці парадак на магілах сваіх продкаў. Тая ж жыццёвая логіка падказвала: калі на Радаўніцу вы заручыліся падтрымкай сваіх продкаў, а на Багача (21.09) парадаваліся сабранаму багатаму ўраджаю, то на Восеньскія Дзяды трэба аддзячыць продкам за дапамогу і падзяліцца з імі набытым багаццем.

Менавіта таму забаранялася ставіць помнікі на магілах пасля Пакровaў (калі зямля засынае) і да Радаўніцы.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Белремстройсвязь» Филиал №6

Лот №1 в составе: **капитальное строение с инв. №710/С-40825 – здание склада**, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, п. Еловики, 37, общ. пл. – 187,3 кв. м, фундамент – бетонный, стены – кирпичные, крыша – шифер, полы – бетонные, г. п. – 1970.
Капитальное строение с инв. №710/С-40824 – одноэтажное, кирпичное административное здание, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, п. Еловики, 37, общ. пл. – 149,3 кв. м, фундамент – бетонный, стены – кирпичные, перекрытие – ж/бетонное, крыша – совмещенная, полы – бетонные, дощатые, линолеум, г. п. – 1960.
Сведения о земельном участке: здания расположены на земельном участке с кадастровым номером 741000000003000584, площадью – 0,2726 га, назначение – для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения (предоставлен на праве постоянного пользования).
Первоначальная стоимость – 16 200,00 белорусского рубля с учетом НДС
Сумма задатка – 1 620,00 белорусского рубля с учетом НДС

Продавец	ОАО «Белремстройсвязь» Филиал №6, УНП 700183719, г. Могилев, ул. Кулибина, 15
Расчетный счет для перечисления задатка	Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», ЦБУ №703 г. Минск, МФО 153001369
Дата, время и место проведения аукциона	**Аукцион проводится 25 мая 2017 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 99, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 24 мая 2017 года до 15.00
Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества	В течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); представившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: – юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации, копии учредительных документов, копию документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; – индивидуальные предприниматели Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации и документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; – физ. лица – паспорт, представители физ. лиц и индивидуальных предпринимателей – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; – иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; – иностранные индивидуальные предприниматели – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; – представители иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованную в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.
Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условие – наличие не менее 2 участников. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5%.
Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, в соответствии со счетом-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.
Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8-0222) 32-43-98, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25

■ Песню бярыце з сабою

«ПА СЦЯЖЫНЦЫ, ДЗЕ ІШОЎ ЛЮБЫ МОЙ, КАХАНЫ..

Мікалай Алешка — таленавіты беларускі баяніст і кампазітар, узначальвае інструментальную групу славутага ансамбля народнай музыкі «Бяседа». Ім напісана шмат прыгожых песень і інструментальных твораў, якія маюць свой характэрны стыль, вельмі блізкі да народнага. Песням уласцівы тонкі лірызм і сардэчная шчырасць, таму яны маюць вялікую папулярнасць у народзе.

Песню «Яблычак румяны» на словы Уладзіміра Пецюкевіча, якую мы сёння прапануем, у свой час цудоўна выканала Валянціна Карэлікава.



ЯБЛЫЧАК РУМЯНЫ

верш Уладзіміра Пецюкевіча *музыка Мікалая Алешкі*

Наліўныя яблычкі
У маім садочку,
У сяброўак — мужыкі,
А мой недзе ў прочках.

Ой, каціся з рук маіх,
Яблычак румяны,
Па сцяжынцы, дзе ішоў
Любы мой, каханы!

Сакавіты, наліўны,
Зачаруй сцяжынку,
Каб вярнула мне хутчэй
Маю палавінку.

Цэлы свет
заваражы
Водарам
мядовым,
Каб мой любы
не забыў
Шлях да майго
дому...

Ой, каціся
з рук маіх,
Яблычак румяны,
Па сцяжынцы, дзе ішоў
Любы мой, каханы!

Рубрыку вядзе кампазітар Уладзімір КАРЫЗНА

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 26 красавіка.
Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Вадзіма.*
К. *Настассі, Яўгеніі, Лукаша, Лявона, Фелікса.*

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 5.53	20.24	14.31
Віцебск	— 5.39	20.18	14.39
Магілёў	— 5.43	20.15	14.32
Гомель	— 5.44	20.07	14.23
Гродна	— 6.08	20.39	14.31
Брэст	— 6.13	20.35	14.22

Фота Ліны МАЛІННАЙ.

ЗАЎТРА



Дарагую **Ірыну Валянцінаўну МУРАЎЁВУ** шчыра віншуем з юбілеем, з прыгожай, круглай датай і ад шчырага сэрца зычым

На многія леты — здароўя, дабра!
Хай кожны дзянёк будзе ў свята!
Хай дом за вярсту абыходзіць бяда,
А радасці будзе багата!



Сям'я РАБЦАВЫХ.

УСМІХНЕМСЯ

Днямі памыў каляровыя рэчы з белымі і атрымаў цікавы вынік. Мяне пабіла мая дзяўчына.

— З Днём нараджэння!
— І?
— Што і?
— Грошы давай!

Прыбраў пухавік, дастаў лёгкую куртку. Знайшоў у кішэні два рублі. Ледзь не заплакаў. Якая вясна — такія і знаходкі.

Дзеці — кветкі жыцця :)
Хлопчык пытаецца ў жанчыны:
— Цётка Галя, а навошта вы ўвесь час фарбуецеся?
— Каб быць прыгожай.
— І праз колькі гадоў гэта дасць эфект?..

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынга — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1483.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 21 красавіка 2017 года.